Скандал, разгоревшийся вокруг аккумуляторного завода более двух лет назад, похоже, стихнет так же незаметно, как и начинался. Уже несколько последних месяцев свидетельствуют о том, что многим из приходящих каждое воскресенье на центральную площадь Бреста с целью «покормить голубей», а затем прошпацировать по одной-другой улице, требуя таким образом от властей закрытия еще не начавшего работать завода, стало ясно: их гражданская активность используется кое-кем не в интересах общих благ, а совсем в иных. И если на первых порах количество «голубятников» от воскресенья к воскресенью увеличивалось, то затем рядом с рьяными инициаторами акций начало появляться все меньше и меньше людей, их поддерживающих. А чтобы избежать саморазоблачения, так называемые предводители народных масс и их помощники в лице блогеров-самоучек стали размещать на местных сайтах информацию о «кормлении голубей» и протестных шествиях по городу зачастую без снимков – чтобы нельзя было судить об убывающем интересе широкой общественности к их акциям*.

Но оставим без комментариев некоторые хитрости тех, кто все же смог долгое время не только будоражить простых жителей крупного областного центра и прилегающих деревень, но и не давать покоя властям. Как местным, так и республиканским. Дело дошло до того, что 14 июня прошлого года председатель Брестского облисполкома А.Лис подписал распоряжение о приостановлении введения в строй аккумуляторного завода «до устранения выявленных нарушений». А через три дня областной комитет природных ресурсов и охраны окружающей среды приостановил разрешение заводу на выброс загрязненных веществ в атмосферу.

Поскольку группа протестующих против ввода в строй аккумуляторного завода напоминала о себе каждое воскресенье, то со стороны властей был сделан встречный шаг. Мол, нужно провести общественную экологическую экспертизу, что прописано в нашем законодательстве. Заметим: в таком случае возможно привлечение независимых экспертов по оценке как проектной документации, так и всех выполненных работ по строительству завода, его функционированию в соответствии с существующими нормами.

30 декабря минувшего года ООО «АйПауэр», как и положено, разместило в средствах массовой информации уведомление о старте процедуры. До 15 января 2020 года принимались заявления от желающих участвовать в независимой экспертизе – как от рядовых граждан Республики Беларусь, так и от общественных объединений, осуществляющих деятельность в области охраны окружающей среды. Пакет документов для проведения общественной экологической экспертизы был передан одному из заявителей – Евгению Скрабутану. Два других инициатора – Дмитрий Бекалюк и Владимир Мороз – от получения документации отказались, ссылаясь на то, что «некоторые паспорта на техническое оборудование… предоставлены на иностранном языке без официально заверенного перевода», а также на то, что, мол, не всё в порядке с оформлением других материалов. При желании не составляло никакого труда прояснить все нюансы в рабочем порядке, но почему-то те, кто раньше с фанатизмом упирал на то, что общественность должна сказать свое слово, без приложения каких-либо усилий ушел от организации проведения независимой экспертизы. В конце концов, у них была масса возможностей решить все интересующие их вопросы в законном порядке, при необходимости дойдя даже до суда. Но они демонстративно не пошли по этому пути, и общественная экологическая экспертиза провалилась.

В то же время руководители ООО «АйПауэр» не отказывались от диалога с общественностью. Наоборот, обрадовались, получив письмо от ОО «Экодом», в котором предлагалось провести «комплексные консультации с общественностью, а также организовать сбор вопросов и мнений, имеющих отношение к планируемой деятельности ООО «АйПауэр».



Чтобы в полной мере реализовать идею ОО «Экодом», решено было наладить еженедельные «круглые столы» с привлечением профильных экспертов, представителей общественности, структур экологической направленности, средств массовой информации. К сожалению, те, кто после ежевоскресного «кормления голубей» водил за собой по главным улицам Бреста несколько десятков человек, публично проигнорировали «круглые столы».

Можно догадываться, как они теперь отнесутся к положительному заключению государственной экологической экспертизы. В минувшую субботу «Народная Воля» связалась по телефону с наиболее активными противниками ввода в строй аккумуляторного завода – Дмитрием Бекалюком, Александром Кабановым и Татьяной Фесиковой. Они, было сказано, остаются при своем мнении: предприятие нужно закрыть, не открывая.

А если унять эмоции и пойти от конкретных фактов? Именно они, серьезнейшие обоснования, легли в основу положительного заключения государственной экологической экспертизы.

Зачинщики «голубиных» протестов нагнетают общественный психоз, утверждая, что аккумуляторный завод, продукция которого содержит вредные реагенты, не может располагаться на территории свободной экономической зоны: очень близко город Брест, рядом несколько сельских населенных пунктов. То есть пусть завод находит себе место в любом другом регионе страны, но не здесь. Хотя в Орше, Шклове, Могилеве или в Витебске и Гродно тоже живут люди… Что, скажите, переселить аккумуляторный завод в Беловежскую пущу, где, кроме зверья, нет ни одной живой души? А если серьезно, то зачем огород городить – есть такой очень серьезный документ Министерства здравоохранения Республики Беларусь, как «*Требования к организации санитарно-защитных зон предприятий, сооружений и иных объектов, являющихся объектами воздействия на здоровье человека и окружающую среду*». Так вот в этом документе четко и ясно сказано: для предприятий, производящих свинцовые аккумуляторы, санитарно-защитная зона должна быть не менее 500 метров. Соблюдена ли эта строгая норма? Соблюдена. Расстояние от границы территории завода до ближайших поселений: в северную сторону (поселок Хабы) – 771 метр, в юго-восточную (поселок Бульково) – 1582, в западную (поселок Тельмы-2) – 2270, в южную (поселок Щебрин) – 1630, в восточную – 2000 метров; до границы города Бреста – более 5 километров. Какие вопросы, протестанты?!

Заметим: выпуск свинцовых аккумуляторов налажен во многих странах. А вы слышали, чтобы там общественность по этому случаю бунтовала? Мы не слышали. Хотя в том же Пястове, пригороде Варшавы, жилые дома расположены через дорогу от производственных цехов аккумуляторного завода. В Познани такое же предприятие расположено в 50 метрах от реки Варта и в 400 метрах от жилых домов. Всем известно, как жестко действуют в Германии «зеленые», поднимают на ноги всю страну, если обнаруживают какой-либо вред здоровью людей и окружающей среде. Так вот в Ганновере расстояние от аккумуляторного завода до реки 200 метров, а до жилых домов – 500.

Что и говорить, под Брестом кампания «АйПауэр», вложив 26 миллионов долларов, построила суперсовременное предприятие, оно не только по этим, но и по всем остальным параметрам соответствует санитарным и иным нормам нашего законодательства, которое, заметим, более требовательное, чем в других странах. Возьмем такую позицию, как рассеивание свинца в зоне расположения завода. Все расчеты показывают, что ни в одном случае концентрация его в атмосферном воздухе не превысит допустимых норм. Более того, она будет во много раз ниже. По результатам исследования, проект аккумуляторного завода ООО «АйПауэр» (с годовым объемом выбросов по свинцу в количестве 17,1 килограмма) имеет более чем пятикратный запас по безопасности для здоровья населения.

Позвонив Д.Бекалюку, который забросал жалобами множество инстанций, мы услышали: «*Президент сказал, что брестчане будут сами решать, быть заводу или не быть. Была назначена общественная экспертиза, но так и не состоялась. В процессе приемки документов были выявлены факты, как мы предполагаем, подделки документов*». О том, кто фактически устранился от организации общественной экологической экспертизы, сказано выше. А вот «*предполагаемой подделкой документов*» занимались органы внутренних дел. Не нашли они следов каких-либо фальсификаций, при том что им были предоставлены оригиналы технической документации на всё оборудование. Об этом Д.Бекалюку сообщено официально: «*…факты фальсификации и подделки документов являются Вашими предположениями, не подтвержденными собранными материалами*». Но он, как ни странно, продолжает гнуть свою линию. Не преследуется ли при этом одна и та же цель – любым способом затянуть процедуру ввода завода в эксплуатацию?!

Наверняка в будущем кто-нибудь подсчитает, сколько рабочих дней, недель, месяцев ухлопали сотрудники различных органов на проверку и перепроверку заявлений, жалоб тех, кому, считай, вот уже три года не дает покоя этот аккумуляторный завод под Брестом. Как же, ни один сигнал не должен быть оставлен без внимания. А потому немало времени пришлось потратить тем же сотрудникам Министерства внутренних дел, например, на проверку фактов о «*нарушениях при выделении земли ООО «АйПауэр» в свободной экономической зоне*». Но вот читаем заключение: «При рассмотрении обращения (*противников аккумуляторного завода.* – **Ред.**) установлено, что земельный участок площадью 5,37 га под строительство и эксплуатацию возводимого аккумуляторного завода предоставлен Брестским райисполкомом 03.11.2016. Далее, в целях строительства отдельных подземных линейных соединений (кабельной линии электропередач, сетей канализации) в марте 2017 года комиссией Брестского райисполкома согласовано место размещения прокладки линии электропередач и канализации. **Сведения о фальсификации разработанных Брестским райисполкомом и УП «Проектный институт Брестгипрозем» земельно-кадастровых документов не подтвердились, нарушений действующего законодательства не установлено».**

И, конечно, мы не можем не процитировать такой фрагмент нашего субботнего разговора с брестскими противниками аккумуляторного завода: «*По нашей информации, с того времени, как завод был построен, и до сего времени никакого дополнительного газоочистного оборудования кампанией закуплено не было*». Уверены, что и Дмитрий Бекалюк, и Александр Кабанов, и Татьяна Фесикова знают, что по оценке отечественных и зарубежных экспертов аккумуляторный завод оснащен самым современным оборудованием такого профиля. К тому же по рекомендации государственной экологической экспертизы дополнительно приобретены две мобильные газоочистные установки. Так что и тут вопросы отпадают.

Газетная площадь, к сожалению, не позволяет нам комментировать каждый пассаж брестских борцов «за народное счастье». Но поделиться с читателями кое-какими раздумьями, пожалуй, стоит. Как нам кажется, не случайно разгорелось пламя вокруг аккумуляторного завода ООО «АйПауэр». Все было тихо, пока Беларусь полностью снабжалась энергозаряжающими батареями извне. Но вот нашлись у нас умные головы, которые сказали: мы что, сами не можем это делать? А аккумуляторный рынок страны – это приблизительно 600.000 изделий в год на сумму ни мало ни много где-то под 50 миллионов долларов США. Кому хочется терять такие деньги?

Скажете: к чему вы клоните? Утверждать, что кукловоды ярых противников аккумуляторного завода под Брестом находятся за кардоном, не будем, как и отрицать этот вполне вероятный факт. Но яснее ясного: появится у нас **своя** «аккумуляторная отрасль» – значит, сузится ***«их»*** рынок, усилится конкуренция. На добрый лад, нашим властям поддержать бы инициативных людей, взявшихся за осуществление крайне важного экономического и социального проекта. То, к чему прилагает все усилия кампания «АйПауэр», – это не просто производство конкурентоспособной продукции, не просто серьезный вклад в решение проблемы импортозамещения, создание немалого количества рабочих мест, увеличение налоговых поступлений в казну, развитие отечественных научных разработок. Проблема Covid-19 показала, как неожиданно могут рушиться международные цепочки технического сотрудничества. Сбои в поставках комплектующих из того же Китая вызывают остановку автомобильных конвейеров в Чехии, Словении, Словакии… Эйфория глобализации завершается, и западные страны всерьез озаботились максимальной локализацией любого производства на территориях собственных государств. А Беларусь автомобильная страна – МАЗ, МТЗ, БЕЛАЗ, «БелДжи»… И создание своей аккумуляторной отрасли имеет важнейшее значение.

Если говорить по большому счету, то это **укрепление безопасности страны**. И когда на этом пути дает о себе знать чья-то злая слепота, то страдающим ею нужно помочь от нее избавиться. И положительное заключение государственной экологической экспертизы – закономерный процесс.

Петр КУПЧИН,
Сергей НИКАНОРОВ.

* Как и можно было ожидать, появившееся 9 апреля положительное заключение государственной экологической экспертизы инициаторы «кормления голубей» использовали для того, чтобы в воскресенье в центре Бреста появилось побольше противников аккумуляторного завода. Как отметил один из местных сайтов, *«12 апреля на площади Ленина в Бресте прошло традиционное кормление голубей в знак протеста против аккумуляторного завода, которое через полчаса после начала переросло в митинг»*. Заметим: для проведения митинга нужно официальное разрешение. А поскольку его не было, то правоохранительным органам пришлось предпринять некоторые действия.

Интересно, как подали воскресную информацию из Бреста столичные сайты.

«TUT.BY»: «Около 150 человек прошли по центру Бреста в масках и с баннером «Нет заводу АКБ».

Радыё Свабода: «На акцию пратэсту ў Берасці прыйшло 200 "акумулятаршчыкаў".

«Наша Ніва»: "На акцыю пратэсту супраць акумулятарнага завода ў Брэсце выйшлі некалькі соцень чалавек у масках".

«Naviny.by»: «Сотни брестчан провели шествие против завода АКБ».

Так все же сколько брестчан участвовало в воскресной акции – около 150 или несколько сотен? И вообще – почему ни слова о сути положительного заключения государственной экологической экспертизы? Что, ни участников акции, ни тех, кто ее взялся освещать, это не интересует?..

ЗА ПРАХАДНОЙ

«Магатэкс» зараз таксама шые маскі

ААТ «Магатэкс» перапрафілявала швейную вытворчасць на выраб шматразовых павязак для твара. На дадзены момант швейная вытворчасць у Магілёве, а таксама філіялы прадпрыемства ў Кобрыне, Полацку і Быхаве выпрацоўваюць сродкі індывідуальнай абароны. У планах нарасціць аб'ёмы да 80 тысяч павязак у суткі.

«З канца лютага мы прыступілі да вытворчасці шматразовых павязак, – распавялі «Народнай Волі» на прадпрыемстве. – *Зараз наладжана ўласная вытворчасць марлі смесавай, а таксама выраб павязак з марлі, баваўняна- і віскозаўтрымліваючай тканіны. Днямі мы атрымалі дэкларацыю адпаведнасці павязак патрабаванням СТБ 638.*

Выраблены на «Магатэкс» сродкі індывідуальнай абароны пастаўляюцца для рэалізацыі праз аптэчную сетку Магілёўскага РУП «Фармацыя», а таксама перададзены супрацоўнікам ААТ «Магатэкс» для выкарыстання на працоўным месцы».

Дарэчы, для шматразовых павязак дзейнічаюць тыя ж патрабаванні па выкарыстанні, што і для аднаразовых: важна мяняць сродкі абароны кожныя 2–3 гадзіны, а ў выпадку ўвільгатнення тканіны ад кашлю ці чыхання – часцей. Шматразовыя вырабы можна мыць уручную ў гарачай вадзе ў мыльным растворы, асобна ад астатняй бялізны, сушыць ў распраўленым стане, абавязкова прагладжваць гарачым прасам з двух бакоў.

ААТ «Магатэкс» – найбуйнейшы вытворца тэкстыльнай прадукцыі ў Рэспубліцы Беларусь, краінах СНД, блізкага і далёкага замежжа. Прадпрыемства працуе з 1973 года. У склад ААТ «Магатэкс» уваходзяць тры фабрыкі – ткацкая, аздобная і швейная, а таксама швейны вытворчы ўчастак у Быхаве, вытворчыя філіялы ў Кобрыне і Полацку.

ВАЖНА!

Што рэкамендуе Сусветная арганізацыя аховы здароўя?

- Перад тым як надзець маску, апрацуйце рукі спіртазмяшчальным сродкам або вымыйце іх з мылам.
- Надзеньце маску так, каб яна закрывала нос і рот без зазораў паміж тварам і маскай.
- Не дакранайцеся да маскі падчас выкарыстання; у выпадку дакранання апрацуйце рукі спіртазмяшчальным сродкам або вымыйце іх з мылам.
- Як толькі маска робіцца вільготнай, замяніце яе на новую.
- Здымайце маску правільна, трымаючыся за гумкі ззаду (не датыкаючыся да пярэдняй часткі маскі), апрацуйце рукі спіртазмяшчальным сродкам або вымыйце іх з мылам.

Галіна РУТ.

ПОДЫУМ

Без гледачоў і ў масках

Сёмы сезон беларускага Brands Fashion Show стаў трэцім модным паказам у свеце (пасля паказу Армані ў Мілане і Mercedes-Benz Fashion Week Russia), які прайшоў без гледачоў. Замест гэтага арганізатары зрабілі стаўку на анлайн.

Яшчэ некалькі месяцаў таму такі фармат паказу мод выглядаў бы дзіўна і нават непрымальна: усё-такі гледачы – неад'емная частка падобных мерапрыемстваў. Аднак жыццё ўносіць свае карэктывы. І ў цяперашняй сітуацыі ў арганізатараў было ўсяго два варыянты: альбо адмяняць шоу, як гэта зрабіла большасць арганізатараў модных паказаў, альбо правесці яго за зачыненымі дзвярыма.

«Адмяніць або перанесці Brand Fashion Show было б самым простым рашэннем. Але, як нам здаецца, не зусім правільным. Жыццё працягваецца, мода не стаіць на месцы, а людзям, чый лад жыцця радыкальна змяніўся, катастрафічна не хапае тых забаў і падзей, якія былі да наступлення пандэміі. І мы вырашылі, што было б несправядліва пазбаўляць іх свята, і сталі першапраходцамі на шляху стварэння відэаверсіі fashion-шоу», – тлумачыць арганізатар праекта, кіраўнік камунікацыйнага агенцтва EffectPromo **Ірына Нікалаева**.

Паводле яе слоў, на прынцыповае рашэнне правесці Brands Fashion Show паўплывала і жаданне падтрымаць беларускіх дызайнераў, якія, як і ўся індустрыя прыгажосці, апынуліся ў складанай сітуацыі. Удзел у шоу быў бясплатны.

Беларускі дызайнер **Іван Айплатаў** кажа, што мода сыходзіць у падполле.

– *Індустрыя прыгажосці звалілася на 95 працэнтаў*, – дзеліцца сваімі назіраннямі Іван Айплатаў. – *Для мяне зараз выдатны час для творчасці, перазагрузкі. Нагода пераглядзець тое, што рабіў да гэтага. І я адчуваю вялікі творчы ўздым. Ёсць некалькі праектаў, і спадзяюся, што я «выстралю» да лета. Што ж тычыцца масак... Ад іх мы нікуды не падзенемся. Кітайцы іх носяць даўно, і нам гэта падавалася дзіўным. Цяпер гэта ўжо не здзіўляе, і людзі нават дыстанцуюцца ад тых, хто не носіць масак. Думаю, у гэтага аксэсуара будзе свая гісторыя, са звычайнага сродку абароны ён ператворыцца ў фетыш. Дарэчы, я адчуваю творчы калапс, калі бачу людзей у гэтых танных марлевых масках, якія да таго ж не абараняюць. Нам захочацца прыгажосці...*

«Мы ўдзячны кожнаму дызайнеру і партнёру, які падтрымаў нас, – падвяла вынікі сезона Ірына Нікалаева. – *Мадэлі ў масках выглядаюць крыху дзіўна, але гэта неабходнасць і нашы сённяшнія рэаліі. Я ўпэўнена, што ўвосень мы сустрэнемся з вамі ў Falkon Club Arena і будзем успамінаць гэтыя няпростыя часы як пэўны вопыт, які мы перажылі і з годнасцю пайшлі далей».*



КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ



Ён пра Ільфа і Пятрова не ўзгадаў своечасова

У Маларыце непахмелены дзяцюк раніцай разбіў акно ў мэблевым магазіне, перабļытаўшы з ювелірным. Пажывіцца брыльянтамі не ўдалося, і дзяцюк пакінуў магазін праз тое ж акно.

Не дзіўна, што мужык уранку
Прачнуўся з хворай галавой,
Бо не адну, напэўна, шклянку
У арганізм набулькаў свой.
Мужык успомніў, што па п'янцы,
Калі заліў мазгі свае,
Паабяцаў купіць каханцы
З брыльянтам кольца і кальє.
(Прызнацца трэ, што ў ходзе п'янкі
Усе амаль што мужыкі
Даюць каханкам абяцанкі,
Затым кусаюць языкі.)
А дзе ж купюры ўзяць на гэта
Яму, прапойцу-мужыку?
Няма таўстога партманета,
І вецер свішча ў кашальку.
"Прабач, – сказаць каханцы міла, –
Наконт каштоўнасцяў – адбой", –
І пляшку таннага "чарніла"
Замест кальє прынесці ёй?
Пакрыўдзіцца каханка можа,
Яшчэ й абурыцца яна.
І, раззлаваная, крый божа,
Больш не дапусціць да сцягна.
Не цешыць тая перспектыва –
Патрэба ейнае сцягно:
Яшчэ мацак, хоць жлукціць піва
І п'е пладовае віно,
Таму цяпер яму й хрэнова,
Падняўся з галавой дурной…
Але ж стрымаць патрэба слова,
Здабыць кальє любой цаной!
Ён для каханкі зверне горы!
І для мяне зусім не ўздзіў,
Што раніцою кумпал хворы
Ідзю хвораю радзіў.
Прыджгаў мужык да магазіна.
Якога? Не зусім відно…
Была ў руцэ яго цагліна,
Цаглінай ён разбіў акно.
Спачатку разгубіўся трошкі,
Затым прапаў настрой былы:
Стаялі ў зале крэслы, ложкі,
Канапы, шафы і сталы.
А ён жа планаваў папасці
У ювелірны магазін,
Дзе ёсць брыльянты розныя масці,
Сапфіры, золата, бурштын.
Ды не туды яго занесла…
Каханка нават і паб'е,
Калі падарыш стол ці крэсла
Замест пярсцёнка ці кальє.
Такая выйшла нечаканка…
Ён да разбітага акна
Ішоў і думаў, што каханка
Усё ж адлучыць ад сцягна…
* * *
Якая просіцца высНова?
Дарма мужык выказваў злосць:
Паводле Ільфа і Пятрова,
Парой брыльянты ў крэслах ёсць…

Галоўны сімптом

– Дакучае ўсім каранавірус.
Быццам з-пад зямлі нягоднік вырас!
Ён такі зласлівы, невядомы…
А якія віруса сімптомы?
– Мае ён сімптомы сапраўды.
Ды найперш выяўляе глузды…

Зараз чых рэжа слых

Калі чыхаў калісьці хтосьці,
Яму казалі:
– Будзь здароў!
І не гучала ў словах злосці,
Ніхто не гнаў да дактароў.
Цяпер зусім інакшы пабыт
І ў маладзёнаў, і ў дзядуль.
Калі чыхае той, хто побач,
Яму гавораць:
– Прэч адсюль!

Два банкеты не пад сілу

Хлапцу дзяўчына даспадобы.
У маці папрасіў рукі.
(Аднаичым мы, што ўчынак добры.)
– Я не аддам сваёй дачкі!
Ты захлынаешся ў аблудзе! –
Хлапцу яна дала адлуп. –
Калі вяселле ўсё-ткі будзе,
Дык цераз мой, як кажуць, труп!
– А варыянт цікавы гэты…
Аднак скажу ў сваю чаргу,
Што пацягнуць аж два банкеты
Пры ўсім жаданні не магу…

Гарадскі

Пра кагосьці кажуць – "гарадскі".
Ён на самай справе хто такі?
Адкажу я фразаю адной:
Для такога цыркам пахне гной…

ХОЧУ СКАЗАТЬ…

Хватит дурить людям голову

Чиновники от власти говорят, что у нас бесплатная медицина. На своем опыте я хочу опровергнуть это утверждение.

Врач, обнаруживший у меня папиллому, порекомендовал сделать дерматоскопию. Для этого пришлось обратиться в частный медцентр, так как в государственной поликлинике нет соответствующего прибора. За процедуру заплатил 9 рублей. Сказали, что папиллому нужно удалять, но перед этим необходимо сделать биопсию. Не затягивая времени, записался на прием в онкодиспансер. Там же вся проблема была решена. Но заплатил 68 рублей 76 копеек.

Врач сказала, что мне нужно встать на учет у онколога в своей поликлинике, по месту жительства. Я последовал этому совету, и меня сразу же записали на УЗИ внутренних органов, но предупредили, что очередь подойдет лишь через 4–5 месяцев. И это называется выявление заболевания на ранней стадии! Не хочешь ждать – обращайся опять в частную клинику, ценники которой не радуют. А где же наша бесплатная государственная медицина, на содержание которой уходят наши налоги?

Может, хватит людям дурить голову, говорить, что у государства забота о здоровье человека на первом плане? Не пора ли сделать нашу медицину страховой? Уверен, когда это произойдет, то многие вопросы будут решены положительно.

Владимир Прохорович ДУЛУБ, житель Гродно.

ГАЗЕТА – ЧЫТАЧ

Сам сябе не пахваліш, дык хто ж цябе пахваліць?..

Добра, што "Народная Воля" ўзялася друкаваць кнігу М.Фарфеля. А то з тых часоў у мяне (мяркую, не толькі ў мяне) засталося ўражанне, што ў тым Вярхоўным Савеце была дэпутацкая група БНФ і яго прыхільнікаў, а астатняе – цёмная пракамуністычная маса. Аказваецца, і ў той цёмнай масе можна выгледзець светлыя плямкі. М.Фарфель піша, што па многіх пытаннях галасаваў за прапановы ад групы БНФ. Па многіх, але не па ўсіх. Цікава было б глянуць, па якіх пытаннях ён не пагаджаўся з пазьнякоўцамі.

Кніга напісана жывой мовай, чытаць цікава. Хаця аўтар дзе-нідзе красуецца (адпаведна яўрэйскай показцы: сам сябе не пахваліш, дык хто ж цябе пахваліць?) і баіцца назваць прозвішчы. Кніга перанасычана ананімамі, якіх "Народная Воля" не любіць. Гэта зразумела: аўтар асцерагаецца, каб з-за нейкай недакладнасці не кінуліся з ім у спрэчку.

Але з-за адной рэчы паспрачацца з ім хочацца.

У Дзяржаве Ізраіль заканадаўча ўведзена вызначэнне нацыянальнасці па маці (нідзе больш такой нормы няма). Няцяжка ўбачыць сэнс гэткай ініцыятывы: цяпер Ісус Хрыстос павінен лічыцца яўрэем. Аб чым і сведчыць М.Фарфель у сваёй кнізе. Але не варта Хрыста прысабечваць да адной нацыянальнасці. У Яго няма нацыянальнасці, ён – Чалавек свету. А што ў маленстве зрабілі абразанне, дык, па-першае, у малога ніхто не пытаўся пра гэта. А па-другое, калі зрабіць абразанне індусу, ці стане ён пасля гэтага яўрэем? Абразанне ні пра што не сведчыць, акрамя таго, што яго выконвалі яўрэі.

Успомнім жа пра бацьку Ісуса і не будзем прывязваць Яго, Сына Божага, да пэўнай нацыянальнасці.

Міхась БУЛАВАЦКІ.

ПАМЯЦЬ

Спяць вечным сном у Моталі венгры…

Больш за трыццаць гадоў я адпрацавала настаўніцай гісторыі, цяпер на пенсіі. Выкладала пераважна ў Мотальскай СШ №1, багатай сваімі традыцыямі і творчым падыходам да педагагічнай працы. Разам з вучнямі мы вывучалі гісторыю не толькі на ўроках, але і ў паходах-экскурсіях па жыццёвых дарогах землякоў-герояў, падчас якіх сабралі каштоўны краязнаўчы матэрыял. Як вынік – вуліцы, названыя ў гонар першага дырэктара Мотальскай школы Вольгі Міронавай, расстралянай фашыстамі ля сцен пінскай турмы, і братоў Міхоўвічаў, якія загінулі на фронце: Сцяпан і Пятро – у Чэхіі, Фёдар – у Германіі.

Нядаўна мы наведалі мясціны, звязаныя са знакамітым абаронцам праваслаўнай веры Апанасам Філіповічам. Пабывалі і ў вёсцы Купяцічы на Піншчыне, дзе ў храме захоўваецца цудатворная ікона, адна з найстаражытнейшых у Беларусі. Ад 90-гадовай жыхаркі вёскі мне давялося пачуць пра трагічную гісторыю салдат-венграў, якія загінулі падчас бамбардзіровак і пахаваны ў шасці брацкіх магілах ля мясцовай царквы. На жаль, магілы сёння занядбаны, ніякага помніка на іх няма.

Праз "Народную Волю" я звяртаюся да Пасольства Венгрыі з прапановай узяць пад апеку пахаванні суайчыннікаў. Мы не павінны быць абыякавымі да памяці загінуўшых.

Ніна КСЁНДЗ. в.Моталь-1 Іванаўскага раёна.

РЭЗАНАНС

Не будзе беларускай мовы – не стане і беларускай дзяржавы

На старонках "Народнай Волі" апошнім часам з'явілася серыя публікацый, у якіх закранаецца праблема дзяржаўнага двухмоўя. Мне найбольш блізкая пазіцыя доктара гістарычных навук Леаніда Лыча, выказаная ім у артыкуле "Ці не час развітацца з двухмоўем?". Цалкам пагаджаюся з аўтарам, што зрабіць гэта трэба неадкладна. Бо за гады ўзаконенага дзяржаўнага двухмоўя беларуская мова апынулася на мяжы знікнення. А згіне мова – згіне і нацыянальная культура, згіне і нацыя.

Ці зможам мы адысці ад катастрафічнай мяжы? Упэўнены: яшчэ не позна. Але толькі пры наступных акалічнасцях. Па-першае, кіраўніцтва краіны павінна карэнным чынам памяняць сваё стаўленне да беларускай мовы, якая ляжыць у аснове ўсёй нацыянальнай культуры. Па-другое, беларуская мова павінна прыйсці ў кожную сям'ю, выкладанне на ўсіх школах і ВНУ мусіць адбывацца па-беларуску. Па-трэцяе, друкаваныя і электронныя дзяржаўныя СМІ павінны перайсці на беларускую мову. Бо сёння толькі некалькі газет – беларускамоўныя, а цалкам беларускамоўных тэлеканалаў зусім няма. Нават раёнкі зрабіліся рускамоўнымі. Амаль поўнасцю ігнаруюць беларускую мову "Народная газета" і "Рэспубліка".

Наш "Пінскі веснік" зарэгістраваны як беларускамоўнае выданне, але бываюць нумары, дзе матэрыялаў па-беларуску – нуль. Узяла адвочны курс на русіфікацыю Палесся і "Палесская праўда". Ведаю, што не лепшае становішча і ў другіх рэгіёнах Беларусі.

А што творыцца на Беларускім тэлебачанні?! Пастаянна трэба пераключацца з канала на канал, каб натрапіць на беларускамоўную перадачу. На канале "Беларусь 3" навіны культуры ідуць на роднай мове, але калі вядучыя бяруць у кагосьці інтэрв'ю, то адразу пераходзяць на рускую. Чаму? Хто ім даў такое ўказанне?

І як здзек – на 1-м канале перадача "Размаўляем па-беларуску" займае… адну хвіліну. Адну хвіліну! А ўсе шматдзённыя серыялы ідуць, вядома ж, па-руску. Адсюль мая высНова: тэлебачанне ў нашай краіне мэтанакіравана знішчае мову тытульнай нацыі.

Я перакананы, што сёння лёс беларускай мовы залежыць ад аднаго чалавека. І гэты чалавек – прэзідэнт краіны. Як толькі ён павернецца тварам да нацыянальных каштоўнасцяў, мовы і гісторыі, усе чыноўнікі імгненна зробяць тое самае. Так ужо было ў нашай краіне. Вопыт ёсць.

Таму я звяртаюся да прэзідэнта: выратуйце беларускую мову! Не стане мовы – не стане і дзяржавы пад назвай Рэспубліка Беларусь.

Уладзімір ГУК, жыхар в.Бобрык Пінскага раёна.

ДАВЕДАЧНАЕ БЮРО



На пытанні чытачоў адказвае старшыня Пухавіцкай раённай арганізацыі ГА «Беларускае таварыства абароны правоў спажыўцоў» Васіль ВАЛАСЮК.

Не спадабалася работа фотамайстра

Зрабілі фота ў адной прыватнай фірме па аказанні фотапаслуг, а мне наогул не спадабалася работа фатографа. Па-першае, я на фота сяджу "над вуглом", па-другое, на фотапаперы бачны нейкія плямы. Фота ўжо надрукавалі, але ці можна запатрабаваць, каб зрабілі дубль?

Антон МАЛІЦКІ, г.Валожын.

– Калі вы прымаеце работу альбо паслугу, напрыклад, хімчысткі, цырульні ці фотамайстэрні і ў ёй ёсць відавочныя недахопы, то можаце заявіць прэтэнзію, але павінны гэта зрабіць адразу.

Мільгае экран планшэта

Падарыў сыну планшэт, але ўжо праз месяц заўважылі, што экран прыкладна пасля гадзіны працы пачынае мільгаць. Што рабіць?

Валерый БУДАНАЎ, г.Кобрын.

– Вы маеце права звярнуцца ў сэрвісную майстэрню для ліквідацыі недахопаў. Можна таксама адмовіцца ад рамонту і запатрабаваць у прадаўца замены апарата.

Ці можна вярнуць у магазін малако?

Набыла ў магазіне тры літры малака, каб не бегаць за ім штодзень. А вечарам яшчэ і муж прынёс тры літры – ім выдалі на прадпрыемстве. Ці можна вярнуць малако ў магазін (чэк захаваўся)?

Галіна ПАДРЭЗ, Гродна.

– Майце на ўвазе, што якасныя харчовыя тавары нельга вярнуць альбо абмяняць. Таксама нельга вярнуць ці абмяняць біжутэрыю, мэблевыя гарнітуры і наборы, парфюмерыю, касметыку і гэтак далей.

Не той заплечнік

Праз інтэрнэт-магазін купіў заплечнік, спакусіўшыся на рэкламу гэтага тавару на адным з сайтаў. На фота ён выглядаў вельмі прывабным, у апісанні таксама было пазначана шмат пераваг перад іншымі заплечнікамі.

У рэальнасці, калі атрымаў тавар, аказалася, што даслалі зусім не той заплечнік. У ім няма і паловы таго, што абяцалі. Што зараз рабіць?

Андрэй РОГАЧ, г.Дзяржынск.

– Вы маеце права вярнуць тавар у магазін. Паштовыя выдаткі па вяртанні тавару вам павінны кампенсаваць.

Фірма схавалася

Купіў для дзіцёнка 3D-ручку, але ўжо праз тыдзень ёй спатрэбіўся рамонт, бо яна забілася пластыкам. Патэлефанаваў у кампанію, дзе набываў тавар, тэлефон адключаны. І ўсе астатнія кантакты фірмы аказаліся недаступнымі. Што мне зараз рабіць?

Сцяпан КАВАЛЕВІЧ, г.Добруш.

– Калі не ўдасца знайсці гаспадароў фірмы, можаце звярнуцца ў праваахоўныя органы. Калі ж заявіць уласнікі магазіна знойдуцца, то заяўляйце патрабаванні з прэтэнзіяй аб вяртанні грошай у добраахвотным парадку.

Плачу грошы за непатрэбныя паслугі

Мая дачка сказала, што нейкім чынам я падключыла свой тэлефон на атрыманне анекдотаў, прагнозу надвор'я і іншай непатрэбнай мне інфармацыі. За ўсё гэта плацiла налькі месяцаў. Ці можна зрабіць так, каб застрахавацца ад такога падключэння?

Святлана КАЛІЧЭНКА, Эзльвенскі раён.

– Па-першае, адразу звярніцеся да аператара мабільнай сувязі, каб вам адключылі ўжо падключаны сэрвіс, альбо зрабіце гэта самі. Мяркую, аператар вам і дасць параду, як зрабіць так, каб зноў мімаволі не "парадаваць" сябе якім-небудзь платным сэрвісам.

Зламаў ноўтбук

Ноўтбук зламаўся па маёй віне, гарантыйны тэрмін не сышоў. Мае дзеянні зараз?

Станіслаў ПАШКЕВІЧ, г.Ліда.

– Звяртайцеся ў любы спецыялізаваны сэрвісны цэнтр, там вам адрамантуюць тэхніку.

Магазін не адказвае

Аддаў тэлевізар, які быў з недахопамі, у магазін, там сказалі, што зробяць рамонт па гарантыі. Маўляў, патэлефануюць, калі адрамантуюць. Прайшоў месяц, але нічога не чуваць. Што рабіць?

Віталь ПАРЧЫНСКІ, г.Полацк.

– Калі ў вызначаныя заканадаўчым тэрміны прадавец альбо вытворца не адказаў ці не задаволіў вашых патрабаванняў, звярнайцеся ў дзяржаўны орган па абароне спажыўцоў, грамадскую арганізацыю альбо ў суд.

РЭДКІ ВЫПАДАК

Тапелец



Я тады яшчэ ў школу хадзіў, але тое, што адбылося аднойчы ў нашым двары, памятаю даволі яскрава.

У нас кватараваў сельскі аграном Мікалай Елісеевіч Крайко з вёскі Матарова Пухавіцкага раёна. Паабяцаў ён неяк свайму дзядзьку Супрону нарыхтаваць дубовых чурбанчыкаў на слупкі для плота. У нашым Чэрвенскім раёне зрабіць гэта можна было без асаблівых праблем, а ў Матарове дубовых дзялянак паблізу проста не аказалася. Абяцанне сваё пляменнік выканаў, і прыгожыя роўненькія слупкі праз тыдзень былі ўжо складзены паміж плотам і драўляным зрубам калодзежа ў нашым двары.

Трэба адзначыць, што збудаванне гэта было даволі глыбокім – каля пятнаццаці метраў, бо сядзіба наша размяшчалася на высокім узгорку. Па тэрміновай тэлеграме дзядзька Супрон на шырокіх санях прыехаў без затрымкі, на другі ж дзень. Павячэралі, добранька "пагудзелі", бо Мікалай Елісеевіч для сустрэчы жаданага сваяка прынёс з вясковай крамы аж некалькі пляшак "каленвалу".

Назаўтра, ледзь зарасілася святло, усе ўжо былі на нагах. Мароз-траскун за ноч так прыкаваў да снегу сані, што трое мужыкоў ледзь скранулі іх з месца. Ніжнія чурбанкі таксама добра прымерзлі, і выносіць іх з-за калодзежа аказалася не так і зручна. Некалькі слупкоў ужо ляжалі на вазку. Супрон чарговы раз зайшоў у вузкі праход і з усяе сілы стукнуў нагой па прымерзлай дзеравяшцы. І тут здарылася непапраўнае. Чурбанчык бордзенька пакаціўся з-пад валёнак уперад, а дзядзька Супрон, не ўтрымаўшыся на не вельмі цвёрдых нагах, шуганул у калодзеж. Мы ўсе пачулі шумны шоргат ягонай галавы і абутых у валёнкі ног аб драўляны калодзежны зруб, магутны ўсплёск вады… і напружаная цішыня паралізавала ўсё наша акамянелае зборышча.

– Усё, няма дзядзькі, – толькі і выдыхнуў збялелы ад страху наш пастаялец.

Крыху ачуняўшы, Мікалай Елісеевіч на ўсякі выпадак усё ж нахіхнуўся над зрубам і гукнуў:

– Ці жывы ты, дзядзька Супрон?

А адтуль, быццам з таго свету, ціха, але ўпэўнены голас:

– Жывы, але пабіўся крыху і спужаўся вельмі.

– Божухна ж ты мой! Стань ты на скрыню, каб не ў вадзе, а мы тут хуценька пашукаем вяроўкі ці больш людзей паклічам.

– Добра, пачакаю!

Бацька мой чалавек быў запаслівы, гаспадарлівы, доўгія вяроўкі праз пару хвілін былі ўжо ў нашых руках. На ранішні нарад у праўленне саўгаса ішлі маладыя дужыя хлопцы, якіх аграном тут жа завярнуў у наш двор. Адзін канец вяроўкі перакінулі цераз ворат, прывязалі да ацынкаванага вядра і разам з цэпам пусцілі на дно калодзежа.

– Цяпер ты, дзядзька, адвязвай вяроўку, старанна прывязвайся за пояс, сам становіся ў вядро і трымайся аднячасова за цэп і за вяроўку, а мы цябе ўсе разам цягнуць наверх будзем. Гляздзі толькі, добры вузел зрабі, каб не развязаўся, – камандаваў пляменнік.

– Усё будзе добра, сынок, – запэўніў Мікалая і добраахвотнікаў Супрон.

– Ну, хлопчыкі, з Богам!

Небяспечны груз паволі паплыў угару. Вось ужо і зімовая шапка з падвязанымі пад бараду вушамі паказалася над зрубам. З нейкім ці то нецярпеннем, ці то са страху няшчасны "тапелец" раптам узмахнуў рукамі, мяркуючы зачапіцца імі за беражок калодзежнага зруба, але не дацягнуўся. Ногі вышчаўкнуліся з вядра, вузел, у спешцы завязаны дзядзькам не вельмі ўдала, расслабіўся, і Супрон другі раз забарабаніў на дно калодзежа.

Ніхто і падумаць не змог, што пасля чарговага падзення чалавек зможа застацца жывы. Ды тут калі б нават дубовы той слупок двойчы ўкінуць на гэткую глыбіню, дык ён, мабыць, раскалоўся б напалам. А Супрон ужо без лішняга запытання раптам выкрыкнуў:

– Гэта ж трэба, каб так не пашанцавала! Але не пужайцеся, жывы я, жывы! Вы мне ў вядры спусціце яшчэ які-небудзь матузок надзейны, каб я дадаткова прывязаўся на ўзроўні грудзей да калодзежнага ланцуга і той вяроўкі, на якой вы мяне падымаць будзеце. Цяпер я ўжо разумнейшы буду, добра прымятаюся.

Выцягнулі хлопцы Супрона і другі раз. Цяпер ужо і з каўнер кажуха ўчапіліся, і пад рукі падхапілі. Развязалі ўсе вузлы, і дзядзька адразу ж пашыбаваў у хату. З вушанкі, вопраткі, валёнак нацякло цэлае возера вады на падлогу. Матуля мая падрыхтавала сухую бялізну і сякую-такую бацькаву вопратку. Пляменнік дапамагаў сваяку пераапранууцца, а потым паклаў дзядзьку на свой ложак, накрыў ватнай коўдрай, сваім паліто, наліў цэлую шклянку гарэлкі, і той праз хвіліну-другую задаў такога храпака, што аж шыбіны ў вокнах зазвінелі.

Мы добра накачагарылі сваю вясковую печ, грубку. Развешалі на жэрдачкі мокрую бялізну, высушылі абутак, і ўсё гэта да наступнай раніцы было зноўку гатова да ўжывання.

Да сённяшняга дня ўсе, хто прысутнічаў пры небывалай Супронавай эпапеі, ніяк уцяміць не могуць, за што гэтаму чалавеку Усемагутны Божа падараваў такі шчаслівы выпадак. Вы толькі ўявіце сабе: двойчы паляцеў уніз не спінай, а галавой ці нават нагамі! На шчасце і апранууты быў Супрон ў тоўсты кажух, і вады ў калодзежы было дастаткова. Акрамя таго, у зрубе было некалькі драўляных распорак, якія пры падзенні няшчасны дзядзька збіваў нагамі і галавой. Абараніла яго ад смяротных удараў і шапка-вушанка, якую гаспадар падвязаў пад бараду.

Мікалай Елісеевіч, праводзячы сваяка ў родную вёску з дубовымі слупкамі, сказаў:

– Ну, дзядзька Супрон, пасля гэткай устраскі сто гадоў жыць будзеце…

Мабыць, ён і пражыў бы, ды гарэлачка не дазволіла. Надта ж любіў яе дзядзька Супрон, светлая яму памяць.

Міхась ЗНАК, падпалкоўнік запасу.

НОВОСТИ ГЕРМАНИИ

В ФРГ выздоровели более половины инфицированных коронавирусом



Согласно данным, обнародованным в понедельник 13 апреля Институтом имени Роберта Коха (RKI), в ФРГ зарегистрировано 123.016 инфицированных – на 2537 больше, чем днем ранее. При этом выздоровели 64.300 человек – на четыре с лишним тысячи больше, чем днем ранее. Число пациентов, умерших от коронавирусной инфекции за сутки, увеличилось на 126 и достигло 2799 человек.

По данным RKI, число инфицированных и количество летальных исходов в ФРГ снижается третий день подряд. В то же время данные, обнародованные RKI, могут быть неполными из-за задержек с поступлением информации за минувшие выходные.

Канцлер ФРГ Ангела Меркель 15 апреля проведет телефонную конференцию с главами правительств федеральных земель, чтобы обсудить дальнейшие действия в борьбе с эпидемией. Одной из тем будет возможность смягчения введенных ограничений.

Депутаты бундестага из-за пандемии готовы отказаться от повышения жалованья

Большинство депутатов германского бундестага выступает за отказ от повышения сумм, выделяемых им на представительские расходы, в свете пандемии заболевания COVID-19, вызываемого коронавирусом SARS-CoV-2. *«Я уверен, что мы отыщем совместное решение на предстоящей неделе»*, – заявил председатель фракции Социал-демократической партии Германии (СДПГ) в бундестаге **Рольф Мютцених** изданию Funke Mediengruppe в воскресенье 12 апреля.

Глава фракции Левой партии в бундестаге **Дитмар Барч** назвал такой шаг символическим и само собой разумеющимся в свете нынешней ситуации. А председатель парламентской фракции блока ХДС/ХСС **Ральф Бринкхаус** выразил уверенность, что политики *«не могут жить по-прежнему, когда многие люди теряют работу или переходят на неполный рабочий день»*.

Сейчас депутаты бундестага зарабатывают 10.083 евро в месяц. Эта сумма меняется раз в год 1 июля в соответствии с индексом номинальной заработной платы, определяемым Федеральным статистическим ведомством. В 2019 году номинальная зарплата в стране выросла на 2,6 процента. Таким образом, после очередного повышения парламентарии получали бы 10.345 евро.

Большинство немцев поддерживают продление карантина после 19 апреля

Жители Германии выступают против того, чтобы слишком рано ослаблять карантинные меры, введенные для борьбы с распространением коронавируса.

Об этом свидетельствуют результаты опроса YouGov.

За продление карантинных мер после 19 апреля выступают 44% немцев, еще 12% даже поддерживают усиление уже существующих запретов.

За ослабление карантина высказались 32% опрошенных, а 8% – за отмену ограничений, принятых федеральным правительством.

